**В.А.Грачова,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

# ПРАБЛЕМЫ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ-КУЛЬТУРОЛАГАЎ ДА ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Эканамічная сітуацыя, што склалася ў краіне, патрабуе павышэння сацыяльнай абароненасці выпускнікоў універсітэта культуры. З гэтай нагоды значная частка студэнтаў універсітэта разам з асноўнай творчай прафесіяй набываюць дадатковую, педагагічную спецыялізацыю.

Неабходна адзначыць, што і раней многія выпускнікі пачыналі сваю працоўную дзейнасць у якасці кіраўнікоў гурткоў, студый і нават выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін у школах і класах з паглыбленым вывучэннем прадметаў эстэтычнага цыкла. Неабходнасць надаваць усім студэнтам не толькі трывалыя прафесійныя ўменні і навыкі, але і педагагічныя веды ставіць перад сістэмай педагагічнай падрыхтоўкі ў нашай вышэйшай навучальнай установе якасна новыя задачы.

Патрэбна стварыць сістэму падрыхтоўкі педагога-культуролага, якая будзе суадносіцца з разнастайнымі сітуацыямі прафесійнай дзейнасці:

— мастацкай адукацыяй розных узроўняў і мэт;

— дадатковай адукацыяй, што ажыццяўляецца ўстановамі культуры і пазашкольнымі ўстановамі;

— арганізацыяй вольнага часу насельніцтва і перш за ўсё навучэнцаў рознага ўзросту;

— навукова-даследчай дзейнасцю ў сферы мастацкай адукацыі і эстэтычнага выхавання і інш.

Педагагічная дзейнасць у азначаных сітуацыях мае, безумоўна, творчы характар. А паколькі яна цесна звязана з успрыняццем і стварэннем з'яў мастацтва, такая педагагічная дзейнасць набывае характар мастацка-творчай.

Перш за ўсё неабходна акрэсліць два асноўныя варыян-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ты педагагічнай дзейнасці ў культуралагічнай сферы. Гэта:

— выкладанне тэорыі і гісторыі мастацтва;

— выкладанне практыкі мастацтва.

Абодва гэтыя варыянты педагагічнай дзейнасці ўваходзяць у структуру будучых прафесійных абавязкаў культуролагаў, аднак суадносіны іх на розных спецыялізацыях розныя. Так, студэнты спецыялізацыі "айчынная і сусветная мастацкая культура" скіраваны перш за ўсё на выкладанне тэорыі і гісторыі мастацтва, а студэнты аддзялення народных рамёстваў — на выкладанне мастацкай практыкі.

Тым не менш усе будучыя педагогі маюць патрэбу ў дасканалай тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўцы па комплексе псіхолага-педагагічных дысцыплін. Што тычыцца тэарэтычнай падрыхтоўкі, яна ажыццяўляецца на працягу пяці гадоў навучання і завяршаецца дзяржаўным экзаменам па педагогіцы і псіхалогіі. З набыццём практычных уменняў і навыкаў справа іншая.

Вывучэнне стану педагагічнай практыкі студэнтаў факультэта культуралогіі паказала, што многія з іх лічаць педагагічную практыку нейкім арганізацыйным элементам навучання. Студэнты мала ўвагі звяртаюць на развіццё свайго асабістага педагагічнага майстэрства падчас праходжання практыкі. Між тым аналіз апытання школьнікаў агульнаадукацыйных школ і школ з паглыбленым вывучэннем мастацтва паказаў, што іх уяўленні аб "ідэальным" выкладчыку мастацтва адрозніваюцца ў залежнасці ад тыпу школы. Так, вучні агульнаадукацыйных школ на першае месца вылучаюць гуманістычную скіраванасць педагога, на другое месца яны ставяць яго прафесійныя веды. Значную ўвагу яны надаюць прывабнасці, пачуццю гумару, дабрыні настаўніка.

Іншая карціна назіраецца ў вучняў школ з паглыбленым вывучэннем мастацтва. Для іх прыярытэтнымі ў асобе настаўніка з'яўляюцца веданне прадмета выкладання і уменне добра навучыць прафесійным таямніцам гэтага прадмета. Ім падаецца важным скіраванасць педагога на развіццё

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчай індывідуальнасці вучня. Астатнія рысы добрага настаўніка супадаюць з азначанымі навучэнцамі агульнаадукацыйных школ, але значна саступаюць тым двум, што акрэслены намі.

Такім чынам, асаблівую ролю ў падрыхтоўцы студэнтаў да паспяховага праходжання практыкі набываюць два колы прадметаў:

— якія забяспечваюць фарміраванне светапогляду педагога — філасофія, культуралогія, педагогіка;

— якія дапамагаюць набыць уменні выкладчыка спецыяльных мастацкіх дысцыплін — узроставая і педагагічная псіхалогія, методыка выкладання спецдысцыплін.

Для тых студэнтаў, што не вывучаюць прадметаў, звязаных з развіццём асобы сродкамі тэатральнай педагогікі, важнымі з'яўляюцца заняткі па асновах педагагічнага майстэрства. На гэтых занятках (яны павінны насіць практычны характар) студэнты вучацца валоданню сваім голасам, дыкцыяй, уменню сачыць і кіраваць сваім псіхалагічным станам і інш.

Яшчэ адна праблема практыкі — суадносіны з базамі, у якасці якіх усё часцей выступаюць школы. Трэба падкрэсліць, што забеспячэнне ўмоў для праходжання практыкі з'яўляецца дадатковай праблемай як для педагагічнага калектыву, так і для вучняў. Трэба стварыць пастаянныя базы педагагічнай практыкі, надаць ім спецыяльны статус і распрацаваць шэраг дадатковых стымулаў для педагогаў і вучняў гэтых устаноў.

І апошняе. Творча адораныя дзеці, іх бацькі і педагогі адчуваюць мноства псіхалагічных праблем. Беларускаму універсітэту культуры патрэбна вывучыць гэтыя праблемы, зрабіць іх даследаванне адным з прыярытэтных накірункаў навукова-даследчай дзейнасці.

Удасканаленне педагагічнай практыкі дазволіць зрабіць новы крок на шляху стварэння шматузроўневай, пераемнаснай сістэмы мастацкай адукацыі ў нашай краіне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ